**Тэкст дыктанта**

**для правядзення ўступных іспытаў па беларускай мове**

**ў ДУА "Мінскае абласное кадэцкае вучылішча"**

**10 клас**

**Былая сталіца дзяржавы**

Наваградак. Менавіта так, прычым з націскам на другім складзе, называюць свой горад яго жыхары. Пачуў я пра Навагрудак у часы далёкага дзяцінства. Суседка, бабуля Шура, якая ведала многа старадаўніх паданняў, казак, жахлівых гісторый, аднойчы распавяла, як даўным-даўно ворагі доўга не маглі ўзяць магутны наваградскі замак, што стаяў на высокім узгорку. І не захапілі б яго, каб не выпадак. Ваявода, які кіраваў абаронай, быў даўно закаханы ў іншаземную каралеўну. Неаднойчы сватаўся да яе, аднак прыгажуня кожны раз адмаўляла. І раптам яму перадалі ліст, у якім каралеўна казала, што згодна выйсці за яго замуж. Але будзе гэта толькі тады, калі ён здасць замак. І асьлеплены сваім пачуццём, ваявода расчыніў перад ворагам браму. Я быццам і зараз чую крыху хрыплаваты голас старэнькай Шуры, якая гаравала больш за нас, малых слухачоў, калі расказвала, як ворагі вынішчалі абаронцаў і руйнавалі магутныя муры. (140 слоў) *Паводле М. Багадзяжа*